Источник: "Наша слова" - 2021-04-21

# Аўтар лепшага беларускага сучаснага "Буквара" пакінуў гэты свет



З сумам успрыняла грамадскасць вестку пра адыход **Анатоля Клышкі**, аўтара лепшага беларускага Буквара.

Анатоль Констанцінавіч Клышка беларускі празаік, журналіст, крытык, перакладчык, педагог, заслужаны работнік культуры Беларусі нарадзіўся 16 красавіка 1935 года ў в. Данэйкі (цяпер - у Баранавіцкім раёне Берасцейскай вобласці), вучыўся ў Навагradскай педагагічнай вучэльні, працаваў карэктарам у наваградскай газеце "Звязда", адказным сакратаром рэдакцыі газеты "Физкультурник Белоруссии".

Анатоль Канстанцінавіч скончыў у 1958 годзе філалагічны факультэт БДУ, з'яўляўся супрацоўнікам газеты "Літаратура і мастацтва", з 1958 года быў інструктарам па справах друку ЦК ЛКСМБ, стаў членам Саюза пісьменнікаў СССР у 1960 годзе. З 1958 года Анатоль Клышка вучыўся ў аспірантуры пры Інстытуце літаратуры імя Я. Купалы Акадэміі навук БССР, з 1960 года працаваў у рэдакцыі часопіса " Полымя", з 1961 па 1963 год быў старшым рэдактарам сцэнарнага аддзялення кінастудыі "Беларусьфільм". З 1971 года ён быў загадчыкам лабараторыі навучання грамаце, а затым - аддзелам навучання літаратуры Інстытута педагогікі Міністэрства асветы БССР. У 1981-83 гадах ён загадваў рэдакцыяй выдавецтва "Юнацтва", а з 1986 па 1990 год узначальначальваў аддзел крытыкі часопіса "Полымя". Анатоль Канстанцінавіч Клышка даследаваў развіццё беларускай паэзіі, вершаскладання, методыкі навучання і выкладання літаратуры ў школе.







Буквар А. Клышкі быў створаны з улікам дасягненняў псіхолага-педагагічнай навукі. У ім рэалізоўваліся прынцыпы навучання чытанню і пісьму. Густоўна аформлены "Буквар" Анатоля Клышкі атрымаў залаты мядаль на міжнароднай выставе ў Лейпцыгу (1977).

- Той найвыдатнейшы "Буквар" стаў ці не самай тыражнай беларускай кнігай, - напісаў Міхась Скобла. - У пару майго школьніцтва яго разавы наклад даходзіў да 150.000 асобнікаў. 37 гадоў прамільгнула, а я і сёння помню і ўсе малюнкі буквароўскія, і тэксты!

Анатоль Канстанцінавіч стварыў вялікую колькасць дапаможнікаў па чытанні і пісьме для вучняў падрыхтоўчых і пачатковых класаў. Прыгожымі, змястоўнымі і цікавымі былі яго падручнікі для вучняў "Чабарок" і "Верасок", працягальным і захапляльным - ілюстраваны слоўнік для дзетак "Чую, бачу, гавару". У 2017 годзе А. Клышка выдаў кнігу "Францыск Скарына, Або як да нас дайшла кніга" для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту.

- Дабрадушны, заўсёды жыццярадасны, па-маладому цікаўны да ўсяго на свеце, спадар Анатоль і на дзявятым дзясятку не сядзеў склаўшы рукі, - успамінае Міхась Скобла. - То дасканаліў свой легендарны "Буквар" (выходзілі новыя перавыданні, іх было больш за 40), то перакладаў з арыгінала Марцыяла, то даследаваў жыццёвы і творчы шлях Валянціна Таўлая. Светлая памяць руплівому творцу і вялікаму настаўніку!

***Падрыхтавала Э. Дзвінская.***

Э. Дзвінская. Аўтар лепшага беларускага сучаснага "Буквара" пакінуў гэты свет